# Дасягненні і праблемы ў развіцці прамысловасці СССР і БССР у 1966–1985 гадах

УДК [94+67/68](476)(47).084.9«1966/1985»



**Мікалай НЕСЦЯРОВІЧ, кандыдат гістарычных навук**

Мікалай НЕСЦЯРОВІЧ. Дасягненні і праблемы ў развіцці прамысловасці СССР і БССР у 1966–1985 гадах.
У артыкуле разглядаюцца асноўныя тэндэнцыі і паказчыкі развіцця прамысловасці Беларускай ССР у 1966–1985 гадах. Праводзіцца параўнанне з прамысловым развіццём СССР і найбольш развітых капіталістычных краін. Даецца адказ на пытанне, ці быў застой у развіцці прамысловасці СССР і БССР у акрэслены гістарычны перыяд.
Ключавыя словы: прамысловасць, прамысловае развіццё, тэмпы росту, вытворчасць, застой, прадукцыйнасць працы, фондааддача.

Nikolai NESTEROVICH. Achievements and problems ofthe industrial sector of the USSR and BSSR in 1966–1985.
The article examines the main trends and indicators of the industrialdevelopment of the Belarusian Soviet Socialist Republic in 1966–1985. This is benchmarked against the industrial development of the USSR and the most advanced capitalist countries. The author gives an answer to the question of whether the industry of the USSR and the BSSR experienced stagnation during the specified historical period.
Keywords: industry, industrial development, growth rates, production, stagnation, labor productivity, capital return.

У лютым 1986 года на XXVII з'ездзе КПСС М.С. Гарбачоў, ацэньваючы вынікі развіцця эканомікі і ў цэлым грамадства СССР з моманту прыняцця ў 1961 годзе трэцяй Праграмы партыі, назваў гэтыя гады часам, калі «ў жыцці грамадства пачалі праступаць застойныя з'явы» *[1, с. 3–4]*. Наколькі адпавядаў рэчаіснасці гэты тэзіс новага кіраўніка КПСС і СССР у аспекце развіцця ў 1966–1985 гадах прамысловасці СССР і БССР як вядучай галіны тагачаснай савецкай эканомікі?

У верасні 1965 года (на другі год знаходжання на чале СССР Л.І. Брэжнева) Пленум ЦК КПСС з мэтай далейшага забеспячэння высокіх тэмпаў развіцця грамадскай вытворчасці і павышэння яе эфектыўнасці намеціў



## ПРА АЎТАРА

НЕСЦЯРОВІЧ Мікалай Барысавіч.

Нарадзіўся ў 1959 годзе ў г. Чарамхове Іркуцкай вобласці Расійскай Федэрацыі. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1981), аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР (1989).

У 1981 годзе працаваў настаўнікам гісторыі ў Бор-Дубянецкай васьмігадовай школе Столінскага раёна, потым выкладчыкам гісторыі, грамадазнаўства і савецкага права Столінскага сельскагаспадарчага тэхнікума. З 1989 года – у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі: малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела гісторыі сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, навуковым супрацоўнікам групы па вывучэнню сталінскіх рэпрэсій, старшым навуковым супрацоўнікам аддзела сацыяльна-эканамічнай і палітычнай гісторыі Беларусі, аддзела навейшай гісторыі. З 2018 года – вядучы навуковы супрацоўнік аддзела навейшай гісторыі Беларусі.

Кандыдат гістарычных навук (1990), дацэнт (2023).

Аўтар больш чым 140 навуковых і навукова-папулярных публікацый.

Сфера навуковых інтарэсаў: пытанні эканамічнай гісторыі Беларусі, развіцця яе нацыянальнай дзяржаўнасці ў савецкі і постсавецкі час.

комплекс мер, накіраваны на ўдасканаленне планавання і ўзмацненне эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці. Ён быў агучаны Старшынёй Савета Міністраў СССР А.М. Касыгіным, які стаў галоўным ініцыятарам і кіраўніком правядзення рэформы.

Рэформа прадугледжвала істотную змену суадносін паміж адміністрацыйнымі і эканамічнымі метадамі ў кіраванні прамысловасцю на карысць апошніх. З гэтай мэтай было вырашана павялічыць сферу «нізавога» планавання (на ўзроўні прадпрыемстваў і гаспадарчых аб'яднанняў), пашырыць правы прадпрыемстваў у цэлым і ўзмацніць іх гаспадарчую самастойнасць, зрабіць align="" рознабаковым выкарыстанне метадаў эканамічнага стымулявання праз развіццё гасразліковай сістэмы эканамічных стымулаў, нацэленых на рост прадукцыйнасці працы і якасці прадукцыі. Гэта было адлюстравана ў Палажэнні аб сацыялістычным дзяржаўным вытворчым прадпрыемстве, зацверджаным Саветам Міністраў СССР 4 кастрычніка 1965 года *[2, с. 691–716]*.

Пэўнае пашырэнне сферы дзеяння эканамічных метадаў кіравання прамысловасцю ў выніку ажыццяўлення распачатай у 1965 годзе маштабнай гаспадарчай рэформы прыкметна павысіла эфектыўнасць прамысловай вытворчасці, палепшыла становішча спраў у савецкай эканоміцы ў цэлым. Восьмая пяцігодка (1966–1970), якая супала з правядзеннем рэформы, аказалася самай выніковай у параўнанні з усімі папярэднімі пяцігодкамі (у сувязі з дасягнутымі ўражальнымі эканамічнымі паказчыкамі яна ў СССР атрымала неафіцыйную назву «Залатая пяцігодка»): валавы грамадскі прадукт у Беларусі павялічыўся на 58 %, выраблены нацыянальны даход – на 56 %, агульны аб'ём прамысловай прадукцыі – на 79 % *[3, с. 22–23]*. Зніжэнне тэмпаў росту грамадскай вытворчасці, якое адбывалася пачынаючы з 1961 года, было прыпынена, тэмпы паводле амаль усіх асноўных паказчыкаў прыбавілі.

У выніку прыкметнага ўздыму прамысловасці істотна ўзмацнілася роля рэспублікі ў агульнасаюзнай прамысловай вытворчасці. У 1970 годзе Беларуская ССР, займаючы 0,9 % тэрыторыі СССР і налічваючы 3,7 % яго насельніцтва, павысіла сваю ўдзельную вагу ў прамысловай вытворчасці СССР у параўнанні з 1965 годам з 2,9 да 3,4 % *[3, с. 51; 4, с. 70; 5, с. 10]*.

Паляпшалася якасць шэрагу відаў прамысловай прадукцыі. Так, у выніку працы ў гэтым кірунку калектыву Мінскага трактарнага завода колькасць рэкламацый на трактары «Беларусь» у 1969 годзе ў параўнанні з 1965-м знізілася ў 4,6 раза. За 1967–1970 гады тэхнічны рэсурс мінскіх трактароў быў павялічаны больш як у 1,5 раза, гарантыйны тэрмін работы павышаны з 20 да 24 месяцаў *[6, с. 390, 424]*.

За гады восьмай пяцігодкі значна падняўся тэхнічны ўзровень прамысловай вытворчасці рэспублікі, адбыліся істотныя якасныя змены ў яе структуры. Апераджальнымі тэмпамі развіваліся галіны, што паскаралі навукова-тэхнічны прагрэс у прамысловасці, такія як радыёэлектроніка, прыборабудаванне, машынабудаванне, энергетыка, хімія і інш. Вытворчасць прыбораў і сродкаў аўтаматызацыі ўзрасла ў 3,7 раза, хіміі і нафтахіміі – у 3,3, машынабудавання – у 2, электраэнергіі – у 1,8 раза, што перавышала заданні, устаноўленыя восьмым пяцігадовым планам. Было комплексна механізавана і аўтаматызавана больш за 500 цэхаў, вытворчасцей і ўчасткаў, укаранёна звыш 1330 паточна-механізаваных і аўтаматычных ліній *[7, с. 278, 322]*.

Пры ўсім гэтым тэмпы росту беларускай, як і ўсёй савецкай, прамысловасці па-ранейшаму заставаліся вышэйшымі, чым у найбольш развітых капіталістычных краінах: ЗША, Англіі, Францыі, ФРГ і Італіі. Калі за 1966–1970 гады аб'ём прадукцыі прамысловасці ў СССР павялічыўся на 50 %, то ў ЗША – на 17, у Англіі – на 11, у Францыі – на 35, у ФРГ – на 34 % *[3, с. 90]*. Разрыў ва ўзроўнях прамысловай вытворчасці СССР і ЗША, якія заставаліся лідарам сусветнай капіталістычнай эканомікі, скараціўся яшчэ болей. Калі ў 1963–1964 гадах аб'ём прадукцыі савецкай прамысловасці складаў каля 65 % ад аб'ёму амерыканскай прамысловасці, то ў 1970-м – каля 75 % *[4, с. 82; 8, с. 18; 9, с. 125–126; 10, с. 105; 11, с. 61]*. На мяжы 1960–70-х гадоў у параўнанні з папярэднім часам прамысловасць СССР і БССР дасягнула свайго найбольшага развіцця.

Аднак падчас правядзення гаспадарчай рэформы эканамічныя метады кіравання, некалькі ўмацаваўшыся, усё ж не дамінавалі. Працягвалі панаваць адміністрацыйныя метады, што з'яўлялася адной з асноўных

прычын згортвання гэтай рэформы. Абмежаваная рамкамі і правіламі існуючай каманднай сістэмы гаспадарання, яна не стала закончанай, суцэльнай і ўяўляла набор супярэчлівых мер. Напрыклад, намечанае ёю пашырэнне самастойнасці прадпрыемстваў немагчыма было спалучаць з існаваннем цэнтральных ведамстваў (у прыватнасці, Дзяржплана), якія захоўвалі адміністрацыйную сістэму, што ўмацавалася да таго ж дзякуючы адраджэнню галіновых міністэрстваў пасля скасавання саўнаргасаў эканамічных адміністрацыйных раёнаў у адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 30 верасня 1965 года «Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю» *[2, с. 646–654]*.



**Ёсць мільённы матацыкл!**
**Мітынг на Мінскім матацыклетна-веласіпедным заводзе. 1967 год**

У канчатковым выніку рэформа з буйнамаштабнай ператварылася ў касметычную і да пачатку 1970-х гадоў фактычна перастала дзейнічаць. У наступныя гады прадпрымаліся новыя спробы рэфармавання, «далейшага», у адпаведнасці с партыйнымі ўстаноўкамі, «паляпшэння кіравання народнай гаспадаркай» *[12, с. 76]*. На гэта, у прыватнасці, былі накіраваны: пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 2 сакавіка 1973 года «Аб некаторых мерапрыемствах па далейшым удасканаленні кіравання прамысловасцю» *[13, арт. 31]*, прынятыя 12 ліпеня 1979 года пастанова ЦК КПСС «Аб далейшым удасканаленні гаспадарчага механізма і задачах партыйных і дзяржаўных органаў» і пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб паляпшэнні планавання і ўзмацненні ўздзеяння гаспадарчага механізма на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці працы» *[12, с. 75–119]*, Закон СССР ад 17 чэрвеня 1983 года «Аб працоўных калектывах і павышэнні іх ролі ў кіраванні прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі» *[12, с. 115]*, пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 14 ліпеня 1983 года «Аб дадатковых мерах па пашырэнні правоў вытворчых аб'яднанняў (прадпрыемстваў) прамысловасці ў планаванні і гаспадарчай дзейнасці і па ўзмацненні іх адказнасці за вынікі працы» *[14, с. 442–451]*.

У 1970-я – першай палове 1980-х гадоў прадпрымаліся і іншыя меры, якія таксама ішлі па шляху «ўдасканалення» планавага кіравання народнай гаспадаркай, у напрамку яе частковай дэцэнтралізацыі, «спалучэння» ўмацавання цэнтралізаванага кіравання з павышэннем ролі працоўных калектываў у кіраванні вытворчасцю. Аднак, нягледзячы на рэарганізацыю структуры кіравання, некаторае павышэнне гаспадарчай самастойнасці і ролі прадпрыемстваў, ролі эканамічных рычагоў у кіраванні імі, істотнай перабудовы гаспадарчага механізма не адбывалася. Ва ўмовах, калі захоўвалася і ў цэлым узмацнялася панаванне жорстка цэнтралізаванай дырэктыўна-каманднай сістэмы кіравання народнай гаспадаркай, праведзеныя ў ёй пераўтварэнні насілі павярхоўны характар і ў найлепшым выпадку маглі даць толькі невялікі часовы эфект для развіцця эканомікі.

Усё гэта накладвала адбітак на вынікі развіцця як беларускай, так і ўсёй савецкай прамысловасці ў 1971–1985 гадах, калі ў СССР і БССР выконваліся дзявяты (1971–1975), дзясяты (1976–1980) і адзінаццаты (1981–1985) народнагаспадарчыя планы. З аднаго боку, прамысловасць БССР, як і ўся прамысловасць СССР, абапіраючыся на дасягнуты патэнцыял, прадоўжыла ў цэлым паспяхова рухацца наперад. У 1985 годзе прадукцыя прамысловасці рэспублікі павялічылася ў параўнанні з 1970 годам у 3,02 раза *[15, с. 22; 16, с. 39]*.

У 1971–1985 гадах у прамысловасці СССР і БССР працягвалася развіццё навукова-тэхнічнага прагрэсу, паскарэнне якога XXIV з'езд КПСС (сакавік – красавік 1971 года) абвясціў рашаючай умовай павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці *[14, с. 28, 45]*. Павысіліся тэхнічны ўзровень вытворчасці і якасць прадукцыі, якая выпускалася. За 1971–1985 гады колькасць механізаваных паточных ліній у прамысловасці рэспублікі павялічылася з 3750 да 8131, аўтаматычных ліній – з 369 да 1749, комплексна-механізаваных і аўтаматызаваных прадпрыемстваў – з 151 да 227 *[17, с. 25]*. У 1985 годзе доля прадукцыі вышэйшай катэгорыі якасці ў агульным аб'ёме прамысловай вытворчасці рэспублікі склала 26,4 % *[18, арк. 79–80]* супраць 9,8 % у 1975 годзе *[19, арк. 15]*.

Гаворачы аб поспехах у развіцці ў 1971–1985 гадах прамысловасці БССР і СССР, трэба адзначыць, што гэтаму па-ранейшаму ў значнай меры садзейнічала працоўная актыўнасць рабочых і служачых. Як і папярэдне, яна забяспечвалася па большай частцы неэканамічнымі, адміністрацыйна-мабілізацыйнымі метадамі пры значным ідэалагічным уздзеянні на працоўных. Найважнейшую мабілізуючую ролю працягвала адыгрываць сацыялістычнае спаборніцтва, якое, як адзначалася ў пастанове ЦК КПСС ад 31 жніўня 1971 года «Аб далейшым паляпшэнні арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва» *[14, с. 138–146]*, «на ўсіх этапах сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва было і застаецца магутным сродкам развіцця творчай ініцыятывы мас» і «заўсёды з'яўлялася эфектыўным метадам пад'ёму прадукцыйных сіл».

Працоўная актыўнасць рабочых і служачых паўплывала на тое, што да сярэдзіны 1980-х гадоў Беларуская ССР стала адным з найбольш развітых прамысловых раёнаў СССР. Па-ранейшаму займаючы меней за 1 % тэрыторыі СССР і налічваючы каля 3,7 % яго насельніцтва, Беларусь толькі за дзявятую і дзясятую пяцігодкі павялічыла сваю долю ў прамысловай вытворчасці краіны амаль да 3,9 % *[19, арк. 5; 20, с. 6]*. У 1985 годзе прамысловыя прадпрыемствы рэспублікі выпускалі столькі тавараў народнага спажывання, колькі іх выраблялася ў Літве, Латвіі і Эстоніі разам узятых *[21, арк. 142]*.

Аднак побач з паспяховым развіццём прамысловасці СССР і БССР у 1971–1985 гадах сталі нарастаць негатыўныя з'явы. Ізноў пачалі падаць тэмпы росту вытворчасці. Спыненая ў гады восьмай пяцігодкі тэндэнцыя да зніжэння тэмпаў росту працягвалася. У 1971–1975 гадах сярэднегадавыя тэмпы прыросту прадукцыі прамысловасці Беларусі ў параўнанні з 1966–1970 гадамі паменшыліся ў 1,2 раза, а ў 1981–1985 гадах – у 2,3 раза *[15, с. 23–24; 22, с. 51]*. Ва ўсёй народнай гаспадарцы рэспублікі сярэднегадавыя тэмпы прыросту валавога грамадскага прадукту знізіліся адпаведна ў 1,14 і 1,9 раза, выраблена нацыянальнага даходу – у 1,1 і 1,62 раза *[22, с. 51; 23, арк. 45]*.

Каб спыніць хуткае падзенне тэмпаў эканамічнага росту, асноўны ўпор па-ранейшаму рабіўся на павелічэнне інвестыцыйных укладанняў у народную гаспадарку, якія ў Беларусі ў 1985 годзе ў параўнанні з 1970-м узраслі ў 1,97 раза, у тым ліку ў прамысловую вытворчасць – у 1,86 раза *[17, с. 126]*. Аднак яны не давалі чаканай аддачы. За кошт павелічэння інвестыцый вартасць вытворчых асноўных фондаў усіх галін эканомікі рэспублікі вырасла за гэты час у 3,42 раза, прамысловасці – у 3,86 раза *[24, с. 4, 14]*. У выніку фондааддача, як і ў 1960-я гады, працягвала зніжацца, што чарговы раз канстатавалася, напрыклад, на XXVIII з'ездзе Кампартыі Беларусі, які адбыўся ў лютым 1976 года *[25, с. 21]*. За 1971–1985 гады фондааддача ў эканоміцы нашай краіны знізілася на 29 % *[26, с. 12]*, у тым ліку ў прамысловасці – прыкладна на 27,8 % *[27, арк. 74]*. Толькі за кошт гэтага і толькі ў адзінаццатай пяцігодцы Беларуская ССР недаатрымала нацыянальнага даходу больш чым на 1 млрд руб. *[28, арк. 37]*.

Разам са зніжэннем фондааддачы істотна ўпалі тэмпы росту прадукцыйнасці працы. Калі ў 1971–1975 гадах у беларускай прамысловасці яна павысілася на 43 %, то ў 1976–1980 гадах – толькі на 26, а ў 1981–1985 гадах – на 21 % *[17, с. 47; 22, с. 51; 23, арк. 46]*.

Памяншэнне фондааддачы і тэмпаў росту прадукцыйнасці працы, якія з'яўляліся асноўнымі фактарамі інтэнсіўнага эканамічнага росту, сведчыла, што народная гаспадарка БССР, як і ўсяго СССР, па-ранейшаму развівалася ў значнай меры экстэнсіўным шляхам. Больш за тое, доля інтэнсіўных фактараў росту савецкай эканомікі зніжалася. Калі ў 1966–1970 гадах яна вагалася ў межах 33,5–40 %, то ў 1976–1980 гадах – 23–30 % *[29, с. 478]*.

Да таго ж рэсурсы экстэнсіўнага развіцця сталі хутка вычэрпвацца. Тэмпы прыросту інвестыцый у прамысловасць, як і ва ўсю народную гаспадарку, значна паменшыліся. Калі ў 1966–1970 гадах яны складалі ў беларускай эканоміцы ў сярэднім у год 11,6 %, то ў 1971–1975 гадах – 6,7, у 1981–1985 гадах – 5,3 % *[16, с. 38; 23, арк. 46]*. Інвестыцыі ў прамысловасць БССР у дзявятай пяцігодцы ўзраслі на 43,4 %, у дзясятай – толькі на 28,6, у адзінаццатай – на 25,3 % *[17, с. 126]*. У выніку намецілася тэндэнцыя зніжэння росту прамыслова-вытворчых асноўных фондаў: у 1966–1970 гадах сярэднегадавы тэмп прыросту іх у БССР склаў 10,8 %, у 1971–1975 гадах – 9,05 %, у 1981–1985 гадах – 8,1 % *[21, арк. 8; 30, арк. 65]* (у цэлым па СССР – адпаведна 10,2; 8,6 і 7,6 % *[16, с. 49; 31, с. 50]*). Калі ў дзявятай пяцігодцы ў БССР было пабудавана і ўведзена ў дзеянне 97 новых буйных прамысловых прадпрыемстваў, то ў дзясятай – 53, у адзінаццатай – 37 *[19, арк. 21]*.

Поруч з памяншэннем у 1971–1985 гадах тэмпаў прыросту інвестыцый у прамысловасць ужо ў пачатку 1970-х гадоў рэзервы працоўнай сілы, якія з'яўляліся адным з асноўных экстэнсіўных фактараў эканамічнага росту, былі ў значнай ступені вычарпаны. Прырост колькасці занятых у матэрыяльнай вытворчасці СССР зменшыўся з 2 % у сярэднім у год у 1961–1965 гадах да 1,2 % у 1966–1970 гадах. Да пачатку 1980-х гадоў магчымасці выкарыстаць прырост занятасці ў матэрыяльнай вытворчасці аказаліся яшчэ больш абмежаваныя *[32, с. 255; 33, с. 155–156]*. Павелічэнне колькасці працоўных рэсурсаў у БССР у 1981–1985 гадах складала 122,2 тыс. чалавек супраць 333,4 тыс. у 1976–1980 гадах і 474,5 тыс. чалавек у 1971–1975 гадах *[25, арк. 43]*. Калі ў першыя пасляваенныя пяцігодкі рост працоўных рэсурсаў у гарадах забяспечваўся за кошт жыхароў сельскіх мясцовасцей, то да 1980-х гадоў гэта крыніца практычна сябе вычарпала. У Беларусі за 1959–1963 гады з сельскай мясцовасці ў гарады выбыла 377 тыс. чалавек *[34, арк. 99, 268]*, а за 1966–1970 гады колькасць занятых у сельскай гаспадарцы зменшылася на 88 тыс. чалавек *[5, с. 14]*. У выніку значнага скарачэння прытоку рабочага папаўнення ў сферу вытворчасці прырост сукупнага грамадскага прадукту за кошт прыцягнення дадатковых працоўных рэсурсаў знізіўся ў БССР з 27 % у восьмай пяцігодцы да 10 % у дзясятай *[35, с. 115]*.

**Новая аўтаматызаваная лінія на Мінскім маторным заводзе. 1981 год**



У 1971–1985 гадах, у адрозненне ад папярэдняга 15-годдзя, беларуская прамысловасць, як і ўся савецкая, усё больш адставала ад прамысловасці вядучых капіталістычных краін па эфектыўнасці, тэхнічным і тэхналагічным узроўнях, большасці іншых паказчыкаў. Нягледзячы на тое што падаючыя сярэднегадавыя тэмпы прыросту прадукцыі прамысловасці і шэрагу іншых асноўных паказчыкаў развіцця эканомікі ў СССР і БССР паранейшаму былі вышэйшыя, чым у ЗША *[16, с. 582; 36, с. 624]*, і ў 1985 годзе СССР займаў першае месца ў свеце па вырабе нафты, газу, чыгуну, сталі, жалезнай руды, мінеральных удабрэнняў і г. д. *[16, с. 583]*, паводле міжнародных мерак яго эканоміка, за выключэннем сыравінных галін і галін ваенна-прамысловага комплексу, была неканкурэнтаздольная. У названым годзе доля машын і абсталявання ў савецкім экспарце складала толькі 13,9 % супраць 21,5 % у 1970 годзе *[37, с. 10]*. За адзінаццатую пяцігодку пастаўка

з БССР станкоў на экспарт скарацілася ў 2 разы *[38, арк. 197]*. СССР шчыльней пераходзіў на імпарт машын і абсталявання *[37, с. 10]*. Усё гэта стала своеасаблівым паказчыкам адставання ад прамысловасці найбольш развітых краін свету.

Пераважная большасць прамысловай прадукцыі БССР не адпавядала сусветнаму ўзроўню. У 1986 годзе на ліпеньскім Пленуме ЦК КПБ у гэтай сувязі адзначалася, што ў беларускай эканоміцы няма «ні воднай галіны, дзе бы ўся прадукцыя поўнасцю адпавядала сусветнаму ўзроўню» *[39, арк. 16]*. Паводле звестак ЦСУ БССР, у 1985 годзе доля ўзораў новай тэхнікі, выпушчанай у рэспубліцы, тэхнічны ўзровень якіх быў вышэйшы за найлепшыя айчынныя і замежныя аналагі, склала толькі 12,2 % *[21, арк. 9]*.

Такім чынам, прыведзены канкрэтна-гістарычны матэрыял сведчыць, што ў 1966–1985 гадах развіццё прамысловасці Беларускай ССР у рамках прамысловага комплексу СССР ішло складаным і супярэчлівым шляхам. Намаганні, якія прадпрымаліся кіраўніцтвам СССР і БССР для павелічэння аб'ёму прамысловай прадукцыі, паляпшэння яе якасці, паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, для якасных змен у структуры прамысловай вытворчасці, разам з актыўнай працай рабочых і служачых давалі пэўныя пазітыўныя вынікі. Сведчаннем таму было ператварэнне БССР да сярэдзіны 1980-х гадоў у адзін з найбольш развітых прамысловых раёнаў СССР, істотнае павелічэнне яе долі ў прамысловай вытворчасці краіны. І таму казаць пра застой у развіцці прамысловасці СССР і БССР у брэжнеўскую эпоху, як лічыць частка гісторыкаў і публіцыстаў, няма падстаў. Тэмпы росту прамысловасці на працягу 1966–1985 гадоў па-ранейшаму былі высокімі.

У найбольшай ступені пазітыўныя вынікі ў развіцці прамысловасці праявіліся ў гады восьмай пяцігодкі, калі выконвалася распачатая ў 1965 годзе гаспадарчая рэформа. Зніжэнне тэмпаў росту прамысловай вытворчасці БССР, якое адбывалася пачынаючы з 1961 года, было прыпынена, тэмпы прыкметна ўзраслі. Аднак у наступныя гады па меры нарастаючага вычэрпвання экстэнсіўных фактараў тэмпы развіцця беларускай прамысловасці, як і ўсёй савецкай, ізноў сталі зніжацца. Пры гэтым у развіцці прамысловасці сталі нарастаць іншыя негатыўныя тэндэнцыі, што дазваляе казаць пра пэўныя праявы застою. Пачалі няўхільна падаць, прычым істотна, тэмпы прыросту прадукцыйнасці працы, працягвалася зніжэнне фондааддачы, намецілася тэндэнцыя памяншэння росту прамыслова-вытворчых асноўных фондаў, змяншалася доля інтэнсіўных фактараў эканамічнага росту, узмацнялася дыспрапорцыя ў развіцці прамысловых груп «А» і «Б», сталі запавольвацца тэмпы навукова-тэхнічнага прагрэсу. Спробы кіраўніцтва СССР пераламаць гэтыя негатыўныя тэндэнцыі шляхам касметычнага «ўдасканалення» існуючай эканамічнай сістэмы галоўным чынам праз тыя ці іншыя змяненні ў арганізацыі кіравання вытворчасцю ў напрамку яго частковай дэцэнтралізацыі вынікаў не давалі. І калі ў 1966–1970 гадах прамысловасць СССР і БССР працягвала набліжацца да ўзроўню найбольш развітых краін свету, то ў наступныя гады адбываўся адваротны працэс і да сярэдзіны 1980-х гадоў яна істотна шмат у чым адстала ад прамысловасці гэтых краін.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 08.11.2023 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Материалы XXVII съезда Коммунистической партии Советского Союза. – М.: Политиздат, 1986. – 352 с.
2. Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам. 1917–1967 гг. Сборник документов за 50 лет: в 5 т. / сост.: К.У. Черненко, М.С. Смиртюков. – М.: Политиздат, 1967–1968. – Т. 5: 1962–1965 гг. / сост.: К.У. Черненко, М.С. Смиртюков. – 1968. – 750 с.
3. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1970 году: стат. сб. / ЦСУ БССР. – Минск: Статистика, Белорусское отделение, 1971. – 416 с.
4. Народное хозяйство СССР в 1970 г.: стат. ежегодник / ЦСУ СССР. – М.: Статистика, 1971. – 823 с.
5. Развитие экономики Белоруссии в 1961–1970 гг. / Академия наук БССР, Ин-т экономики; под ред. В.И. Дрица. – Минск: Наука и техника, 1978. – 238 с.

6. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі; гал. рэдкал.: І.М. Ігнаценка (старш.) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 5: Беларуская ССР у перыяд стварэння развітога сацыялістычнага грамадства і будаўніцтва камунізму (1945–1974 гг.) / С.Д. Вайтовіч [і інш.]. – 1975. – 776 с.
7. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК (1918–1975): в 6 т. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ – филиал Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – Минск: Беларусь, 1983–1987. – Т. 6: 1966–1975. – 1987. – 623 с.
8. Мировая экономика: Краткий справочник / подгот. К.А. Баклановой [и др.]. – 2-е изд. пересмотр. и доп. – М.: Экономика, 1965. – 307 с.
9. Развитие социалистической экономики СССР в послевоенный период / Ин-т экономики АН СССР; под ред. И.А. Гладкова. – М.: Наука, 1965. – 600 с.
10. «Таковы, товарищи, факты» // Документы русской истории. – 1998. – № 2. – С. 101–125.
11. Экономика стран социализма и капитализма: цифры и факты: учебное пособие по курсу «Экономика зарубежных стран» / подгот. Б.Я. Гершкович [и др.]; под ред. Б.Я. Гершковича. – М.: Высшая школа, 1978. – 184 с.
12. Решения партии и правительства по хозяйственным вопросам: сборник документов / под общ. ред. К.У. Черненко, М.С. Смиртюкова. – М.: Политиздат, 1968–1988. – Т. 13: Апрель 1979 г. – март 1981 г. / под общ. ред. К.У. Черненко, М.С. Смиртюкова. – 1981. – 735 с.; Т. 15. Ч. 1: 1983 г. – май 1984 г. – 1985. – 542 с.
13. О некоторых мероприятиях по дальнейшему совершенствованию управления промышленностью: постановление Центрального Комитета КПСС и Совета Министров СССР, 2 марта 1973 г., № 139 // Собрание постановлений правительства Союза Советских Социалистических Республик. – 1973. – № 7.
14. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898–1988): в 16 т. / Ин-т марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – 9-е изд., доп. и испр. – М.: Политиздат, 1983–1990. – Т. 14: 1981–1984. – 1987. – 639 с.; Т. 12: 1971–1975. – 1986. – 574 с.
15. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1987 г.: стат. ежегодник / Госкомстат БССР. – Минск: Беларусь, 1988. – 296 с.
16. Народное хозяйство СССР в 1985 г.: стат. ежегодник / ЦСУ СССР. – М.: Финансы и статистика, 1986. – 655 с.
17. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1985 г.: стат. ежегодник / ЦСУ БССР. – Минск: Беларусь, 1986. – 240 с.
18. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 7. Воп. 10. Спр. 293.
19. НАРБ. – Ф. 30. Воп. 9. Спр. 7701.
20. Сидор, С.И. Белорусская ССР в одиннадцатой пятилетке / С.И. Сидор. – Минск: Народная асвета, 1983. – 63 с.
21. НАРБ. – Ф. 30. Воп. 13. Спр. 19.
22. Народное хозяйство СССР за 70 лет: юбилейный стат. ежегодник / Госкомстат СССР. – М.: Финансы и статистика, 1987. – 765 с.
23. НАРБ – Ф. 30. Воп. 13. Спр. 617.
24. Народное хозяйство Белорусской ССР в 1988 г.: стат. ежегодник / Госкомстат БССР. – Минск: Беларусь, 1989. – 264 с.
25. Материалы XXVIII съезда Коммунистической партии Белоруссии. – Минск: Беларусь, 1976. – 175 с.
26. Матэрыялы XXX з'езда Камуністычнай партыі Беларусі. – Мінск: Беларусь, 1986. – 223 с.
27. НАРБ. – Ф. 30. Воп. 9. Спр. 7872.
28. НАРБ. – Ф. 30. Воп. 9. Спр. 7739.
29. Экономическая история СССР: очерки / Ин-т экономики РАН; рук. авт. кол. Л.И. Абалкин. – М.: ИНФРА-М, 2007. – 496 с.
30. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 10. Спр. 856.
31. Народное хозяйство СССР в 1980 г.: стат. ежегодник / ЦСУ СССР. – М.: Финансы и статистика, 1981. – 583 с.
32. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / І.М. Абрамаў [і інш.]; рэдкал. А.П. Вайтовіч [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2000. – 429 с.
33. История социалистической экономики СССР: в 7 т. / Акад. наук СССР, Ин-т экономики; редкол.: И.А. Гладков (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1976–1980. – Т. 7: Экономика СССР на этапе развитого социализма (1960–1970-е годы) / В.А. Виноградов [и др.]. – 1980. – 718 с.
34. НАРБ. – Ф. 30. Воп. 9. Спр. 741.
35. Гиоргидзе, З.И. Белоруссия за десять пятилеток / З.И. Гиоргидзе, Л.Ф. Геращенко. – Минск: Наука и техника, 1982. – 152 с.
36. Народное хозяйство СССР в 1987 г.: стат. ежегодник / Госкомстат СССР. – М.: Финансы и статистика, 1988. – 736 с.
37. Научно-технический прогресс в СССР: стат. сб. / Госкомстат СССР. – М.: Финансы и статистика, 1990. – 270 с.
38. НАРБ. – Ф. 7. Воп. 10. Спр. 328.
39. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 160. Спр. 389.